і добра апрацованых. Напісаны яны ў клясычным дусе. Тэмы—казаньне, малюнкі прыроды, з якіх шмат урэзваецца ў памяць:

"Гэй спокійно і синьо над садом,
а над морем—задуменны сон.
на заходзі губною помадою
написав и розвіз... горизонт.

На гэтым я канчаю разгляд першага тому „поэзіі" Сосюры. Аглядаючы сваю творчасьць, Сосюра мабыць выдасьць і наступныя томы, аб якіх у будучыне спадзяюся напісаць.

**Барыс Папкоўскі**

**Ю. Бібіла.** Летапіс беларускага друку. Частка II. *Паасобныя выданьні на беларускай мове (з дадаткам проклямацый і адозваў 1863 і 1905 г.). 1835—1916 гг. Выданьне Беларускай Дзяржаўнай Бібліотэкі, Менск, 1929, 197×215 мм, 800 паасобнікаў, цана 65 кап.*

Справа падліку друку зьяўляецца надзвычайна важнай як для штодзеннага жыцьця, так і для навуковай працы. Бібліотэкар, настаўнік, спэцыялісты, навуковы работнік—усе адчуваюць вялікую патрэбу ведаць, што надрукавана на беларускай мове наогул і што ўласна—па спэцыяльнасьці кожнага. Але ня ўсякі работнік можа зрабіць для сябе падлік усяго надрукаванага. Тым больш, калі большасьць старых выданьняў ёсьць толькі ў бібліотэках ды ў нязначнага ліку бібліофілаў. Таму праца аўтаркі мае надзвычайную каштоўнасьць. Ёю да гэтага часу ўкладзена і выдана Дзяржаўнай Бібліотэкай часткі III і II гэтага „Летапісу", якія даюць весткі пра паасобныя выданьні 1917—1924 гг. і пра кругабегавы друк да 1925 г. Гэта II частка „Летапісу" абхоплівае на беларускай мове з 1835 да 1916 г. уключна. Такім чынам з выхадам гэтага выданьня аўтаркай падлічаны ўвесь новачасны беларускі друк да 1925 году. З 1925 г., як вядома, падлік кругабегавых і некругабегавых выданьняў вядзецца „Летапісам беларускага друку", які выдаецца Беларускай кніжнай палатай. Калі выйдзе ўкладзены аўтаркай падлік старадрукаў—справа выяўленьня беларускага друку ў асноўным будзе скончана і застанецца толькі праца над дадаткамі, якіх будзе ня так шмат.

У гэтай другой частцы „Летапісу беларускага друку" зьмешчаны весткі пра 244 паасобных выданьні на беларускай мове ды пра 34 проклямацыі на ёй. Выяўленых аўтараў гэтай літаратуры налічваецца каля 80.

Нажаль у гэтай кніжцы няма сыстэматычнага паказчыку кніжнай продукцыі, які-б палегчыў карыстаньне кніжкай розным спэцыялістым, ды і наогул быў-бы вельмі карысным. Да вельмі прыкрых памылак друку трэба аднесьці быццам 1918 год выданьня „Ciekawyś? — Przeczytaj!" В. Дунін-Марцінкевіч, у той час, калі гэта ня так.

Урэшце нас дзівіць чаму гэта выданьне, так патрэбнае для ўсіх школ, бібліотэк і іншых асьветных установ, якіх больш 6.000, вышла толькі ў ліку 800 паасобнікаў.

**М. Стаход**